# Пастаянна павышаць прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы

*В. Лабанок,*

*старшыня выканкома Гомельскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных*

Студзеньскі Пленум ЦК КПСС паставіў перад совецкім народам велічную задачу — давесці штогодні валавы збор збожжа да 10 мільярдаў пудоў, павялічыць вытворчасць асноўных прадуктаў жывёлагадоўлі ў два — два з лішнім разы.

Працоўныя Гомельскай вобласці, як і ўвесь совецкі народ, успрынялі рашэнні студзеньскага Пленума як сваю родную, кроўную справу. Яны настойліва змагаюцца за рэзкае павелічэнне вытворчасці збожжа, мяса, малака, яек, шэрсці і іншых прадуктаў жывёлагадоўлі з тым, каб унесці свой дастойны ўклад у справу стварэння ў краіне багацця ўсіх сельскагаспадарчых прадуктаў.

Адной з галоўных і рашаючых умоў далейшага ўздыму і развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі з'яўляецца ўсямернае павышэнне прадукцыйнасці працы, якая з'яўляецца, як указваў В. І. Ленін, самым важным, самым галоўным для перамогі новага грамадскага ладу.

В. І. Ленін, распрацоўваючы план сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі, указваў, што матэрыяльнай асновай пераводу раздробленых сялянскіх гаспадарак на шлях сацыялізма з'яўляецца буйная індустрыя, прымяненне ў масавым маштабе машын у земляробстве. «Адзінай матэрыяльнай асновай сацыялізма, — гаварыў Ленін, — можа быць буйная машынная прамысловасць, здольная рэарганізаваць і земляробства» (Творы, т. 32, стар. 434).

Грунтуючыся на гэтых палажэннях В. І. Леніна, Комуністычная партыя ў кароткі тэрмін стварыла магутную сацыялістычную індустрыю, арганізавала масавую вытворчасць трактароў і сучасных сельскагаспадарчых машын. Перамога калгаснага ладу ў нашай краіне, стварэнне машынна-трактарных станцый забяспечылі магчымасць узброіць сельскую гаспадарку перадавой тэхнікай і на яе аснове дабіцца бесперапыннага і хуткага росту прадукцыйнасці працы калгаснікаў і работнікаў МТС, павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў.

У МТС сканцэнтравана асноўная маса сельскагаспадарчай тэхнікі: трактары, камбайны і іншыя сельскагаспадарчыя машыны. Узнімаючы ролю МТС у далейшым развіцці калгаснай вытворчасці, партыя і ўрад паклапаціліся аб умацаванні іх спрактыкаванымі кіруючымі кадрамі і спецыялістамі сельскай гаспадаркі, пастаянным саставам работнікаў. Пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС у штаты МТС Гомельскай вобласці залічана 17 335 механізатараў, у іх прышлі на работу 150 інжынераў, тэхнікаў, механікаў. Бесперапынна ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база станцый. У мінулым годзе на будаўніцтва МТС расходавана 25,5 млн. рублёў. Усе гэтыя мерапрыемствы дапамаглі значна ўмацаваць МТС, расшырыць іх дзейнасць, лепш выкарыстаць тэхніку, павысіць прадукцыйнасць усіх машын.

У 1954 годзе машынна-трактарныя станцыі вобласці выканалі ў калгасах трактарных работ на 370 тысяч гектараў больш, чым у папярэднія

гады. У сярэднім на адзін умоўны 15-сільны трактар выпрацавана 410 гектараў. За апошнія чатыры гады механізацыя сельскагаспадарчых работ у калгасах вобласці ўзрасла па сяўбе ў тры разы, уборцы збожжавых культур камбайнамі — у пяць разоў, сенакашэнню — у дзесяць разоў, пасадцы бульбы — больш чым у тры разы. Аб ворыве не прыходзіцца і гаварыць, яно амаль поўнасцю ажыццяўляецца трактарамі. У выніку палепшання работы машынна-трактарных станцый у 1954 годзе ў калгасах вобласці пасяўныя плошчы расшыраны на 23,6 тысячы гектараў. Павысіўся ўзровень агратэхнікі. Многія калгасы дабіліся некаторых поспехаў у развіцці эканомікі, уздыме ўраджайнасці, развіцці жывёлагадоўлі, атрымалі з кожнага гектара зямельных угоддзяў больш, чым у папярэднія гады, збожжа, бульбы, гародніны, малака, мяса і іншых прадуктаў. Грашовыя даходы калгасаў узраслі на 80,5 млн. рублёў. Калгасамі датэрмінова выканан дзяржаўны план нарыхтовак і закупак збожжа, бульбы, гародніны, ільнопрадукцыі, шэрсці.

Усё гэта гаворыць аб тым, што МТС ужо цяпер абслугоўваюць асноўныя сельскагаспадарчыя працэсы, ва ўсё ўзрастаючых размерах ахапляюць усе бакі сельскагаспадарчай вытворчасці, аблягчаючы працу калгаснікаў, павышаючы яе прадукцыйнасць.

Характэрным прыкладам рацыянальнага выкарыстання тэхнікі і высокай прадукцыйнасці працы можа служыць Уваравіцкая МТС. Тут выпрацоўка на кожны 15-сільны трактар з кожным годам узрастае пры зніжэнні сабекошту работ. У 1954 годзе план трактарных работ МТС выканала на 124 працэнты, на кожную 15-сільную машыну выпрацавана 575 гектараў, або на 132 гектары больш, чым у 1953 годзе. На кожны гектар умоўнага ворыва МТС дабілася эканоміі сродкаў па рамонту — 3 руб. і па затратах гаручага — 1 руб. Вытворчыя заданні выкананы ўсімі трактарнымі брыгадамі і кожным трактарыстам.

Шляхам механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэння прадукцыйнасці працы механізатараў МТС садзейнічае няўхільнаму росту грамадскай гаспадаркі калгасаў. План развіцця грамадскай жывёлагадоўлі 1954 года ў калгасах зоны выканан па ўсіх відах жывёлы. Надой на фуражную карову склаў 1 120 літраў малака, або на 327 літраў больш, чым у 1953 годзе, грашовыя даходы калгасаў за мінулы год узраслі ў чатыры разы. Умацавалася працоўная дысцыпліна. Усе калгасы зоны МТС датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках і натураплаце за работы МТС.

Добрых паказчыкаў дабіўся калектыў Брагінскай МТС. У мінулым годзе механізатары выканалі план трактарных работ на 120 працэнтаў. Усе палявыя работы праведзены ў сціслыя тэрміны і на высокім узроўні агратэхнікі. Гэта дало магчымасць павялічыць валавы збор збожжа ў абслугоўваемых калгасах на 14,1 працэнта, бульбы — на 31 працэнт, закласці сіласу ў 2 разы больш, чым у 1953 годзе. Брыгада М. С. Процкі гэтай МТС, якая абслугоўвае калгасы «Шлях да комунізма» і імя Тэльмана, дасягнула выпрацоўкі на 15-сільны трактар 586 гектараў умоўнага ворыва і забяспечыла ў калгасе «Шлях да комунізма» збор збожжавых культур з усёй плошчы па 14,4 цэнтнера, бульбы 191 цэнтнер з гектара Затраты працадзён на вытворчасць цэнтнера збожжа тут знізіліся за апошнія тры гады на 40 працэнтаў. Нядрэнны ўраджай атрыман у сельгасарцелі імя Тэльмана. Характэрным з'яўляецца тое, што сабекошт цэнтнера збожжа ў гэтай трактарнай брыгадзе на 39 рублёў ніжэй сярэдняга сабекошту па МТС. Калі-б усе трактарныя брыгады Брагінскай МТС працавалі так, як працуе брыгада тав. М. С. Процкі, калгасы зоны МТС атрымалі-б дадаткова каля 200 тысяч пудоў збожжа і сэканомілі больш 1 мільёна рублёў за кошт зніжэння сабекошту трактарных работ.

Трэба адзначыць, што Уваравіцкая і іншыя перадавыя машынна-трактарныя станцыі вобласці: Брагінская, Рудакоўская, Капаткевіцкая, Багданавіцкая, Палеская па тэхнічнаму аснашчэнню і ўмовах работы не маюць перавагі ў параўнанні з іншымі станцыямі. Тым не менш некаторыя МТС працавалі дрэнна і не забяспечылі ўздым ураджайнасці і прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі. Кісялёўская МТС, напрыклад, у 1954 годзе план трактарных работ выканала, але аналіз яе дзейнасці паказвае, што вытворчыя рэсурсы выкарыстоўваюцца недастаткова і часта няправільна.

Парушаючы дагаворныя абавязацельствы з калгасамі, механізатары гэтай станцыі імкнуцца выканаць найбольш лёгкія работы. У выніку заданне па ўздыму зябліва выканана на 29,8 працэнта, пасадцы бульбы — на 28,6 працэнта, сенакашэнню — на 38 працэнтаў. З плана закладкі сіласу 1 500 тон засіласавана ў калгасах толькі 409 тон. МТС не забяспечвае высокай агратэхнікі вырошчвання сельскагаспадарчых культур, тэхніка выкарыстоўваецца нездавальняюча. Толькі гэтым можна растлумачыць, што ў калгасах зоны Кісялёўскай МТС ураджайнасць збожжавых культур у 1954 годзе на 22,5 працэнта ніжэй, чым, напрыклад, ва Уваравіцкай МТС.

Яшчэ дрэнна працуюць і не выкарыстоўваюць наяўных магчымасцей па забеспячэнню павышэння ураджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі некаторыя іншыя МТС вобласці. У радзе іх высокі сабекошт атрыманай прадукцыі. Дзельчыцкая МТС, напрыклад, план трактарных работ выканала на 104,8 працэнта, аднак у выніку незахавання асноўных агратэхнічных патрабаванняў калгасы зоны гэтай станцыі ў 1954 годзе атрымалі валавы збор збожжа на 2,5 тысячы цэнтнераў менш, чым у 1953 годзе. Сабекошт аднаго цэнтнера збожжа склаў 178 руб. пры планавым — 129 руб., бульбы — 42 руб., пры планавым — 26 рублёў. Узровень механізацыі ў калгасах зоны гэтай МТС нізкі, у выніку чаго затраты ручной працы на адзінку прадукцыі ўсё яшчэ высокія. У 1954 годзе затраты на 1 цэнтнер збожжа склалі тут 13,2 працадня, на 1 цэнтнер бульбы — 1,8 працадня.

Нездавальняючую работу раду МТС можна растлумачыць перш за ўсё дрэнным выкарыстаннем тэхнікі. Перадавыя метады сельскагаспадарчай вытворчасці ўкараняюцца слаба. Сацыялістычнае спаборніцтва, абмен вопытам, тэхнічная вучоба механізатараў не арганізаваны.

Важнай умовай павышэння прадукцыйнасці працы ў калгаснай вытворчасці з'яўляецца комплексная механізацыя сельскагаспадарчых работ. У мінулым годзе ў радзе калгасаў побач з расшырэннем механізацыі вытворчасці збожжа ажыццяўлялася комплексная механізацыя вырошчвання бульбы і іншых прапашных культур. У калгасе імя Молатава, Веткаўскага раёна, напрыклад, пасадка бульбы на 240 гектарах праводзілася механізаваным спосабам. Прымяненне машын толькі на пасадцы бульбы дало магчымасць калгасу скараціць амаль удвая працоўныя затраты ў самы напружаны перыяд палявых работ і накіраваць на іншыя важнейшыя ўчасткі калгаснай вытворчасці рабочую сілу, якая вызвалілася.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы